Сэмантычна раскошнае ды завершанае *стома* змушае да рамантычна-высокага асэнсаваньня беларускага прозьвішча, да якога й ты далучаны праз свайго, хто ведае, у якім калене продка.

# Страха

***Ігар Бабкоў***

Чатыры сьцяны — гэта яшчэ ня ўсё. Мацуюцца бэлькі, падымаюцца кроквы, і нарэшце прыходзяць *страхары* са сваімі *страхоўкамі* ды кладуць *страху*. Нават калі *страха* новая, празь яе дыхае неба. *Падстрэшша* — першая прыступка да неба, блізкае і жаданае беларускае надзем'е.

Чаго толькі не захоўвалася на *падстрэшшах* нашых хат — кнігі, старыя газэты, непатрэбныя рэчы. У першай палове стагодзьдзя пад *страху* пераносілі кросны і верацёны, старую вопратку, сапсаваныя гадзіньнікі і прасы. Пасьля другой сусьветнай вайны туды патраплялі беларускія граматыкі і міжваенныя кнігі, рукапісы і цэлыя архівы.

*Падстрэшшы* і сталіся нашымі архівамі. Мышы і ластаўкі там былі архівістамі, кот — дырэктарам, а кроплі дажджу — наведнікамі і чытачамі. Потым усё гэта расшуквалася і рэстаўравалася, пераносілася ў музэі і прыватныя калекцыі. Мы паступова забывалі пра паходжаньне нашых скарбаў, забывалі пра *страху* і *падстрэшша*. Але варта памятаць: ад войнаў і ператрусаў, ад ідэалягічных кампаніяў і разматых чыстак у Беларусі ёсьць свой прытулак — на *падстрэшшы*, бліжэй да неба.

# Струк

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Струк* — слова-загадка. Нягледзячы на тое, што ўва ўсіх славянскіх мовах яно гучыць амаль аднолькава і толькі ў баўгарскай і сэрбскахарвацкай мовах мае, апрача асноўнага значэньня „плод некаторых расьлінаў", яшчэ значэньне „сьцябло, галінка", паходжаньне яго незразумелае. Прынамсі, так цьвердзяць сур'ёзныя і аўтарытэтныя навуковыя выданьні.

Напраўду, ніводнае зь іх не фіксуе таго значэньня слова, якое бытуе ці не ўва ўсёй Беларусі. *Струк* — мужчынскі полавы чэлес, найчасьцей — дзіцячы. Выглядае, што якраз гэтае значэньне звузіла ўжываньне слова ў нашай тапаніміцы й антрапаніміцы.

Вытворнае ад *„струк"* — *струкаваты* — мае ў нашай мове тры тлумачэньні: які мае шмат *струкоў*, падобны да *струка* і кучаравы. З гэтым апошнім і была зьвязаная прозва бацькі Якуба Коласа — Міхала Міцкевіча, які меў кучаравыя валасы і адпаведную мянушку — *Струк*.

Напэўна, ад падобнай мянушкі ўтварылася некалі прозьвішча *Струкаў*. Рыгор *Струкаў* — ваенны дзеяч часоў грамадзянскай і вялікай айчыннай войнаў з-пад Вяліжу. Расеец Дзьмітры *Струкаў* — мастак, археоляг і пэдагог XIX стагодзьдзя, які ў 1864 годзе наладзіў экспэдыцыю ў Беларусь, у часе якой зрабіў безьліч замалёвак нашых мястэчак, помнікаў архітэктуры, іншых збудаваньняў, а таксама твораў выяўленчага мастацтва, сярод якіх і Крыж Эўфрасіньні Полацкай — адна зь нямногіх мастацкіх вываў гэтага хрысь-